# ІРЫНА РАДЗІХОЎСКАЯ: «НА НАПІСАННЕ ВЕРШАЎ МЯНЕ НАТХНЯЕ САМО ЖЫЦЦЁ»



*Паэзія — гэта тое, без чаго многія творцы не ўяўляюць свайго жыцця. Паэзія вучыць адчуваць, перажываць і ўспрымаць рэчаіснасць па-іншаму.*

*Чытаючы вершы лірыкаў, паглыбляешся ва ўласны свет фантазій, атрымліваеш сапраўдную асалоду і натхняешся сам.*

*А нядаўна я адкрыла для сябе новае імя ў паэзіі — **Ірына Радзіхоўская**. Ірына — студэнтка філалагічнага факультэта нашага ўніверсітэта, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Тры гады таму ў яе выйшла кніга вершаў «Ідолта». Напярэдадні Міжнароднага дня паэзіі я сустрэлася з маладой паэткай, каб паразмаўляць пра яе творчае жыццё.*

***— Іра, калі ты пачала пісаць?***

— Першым маім вершам была невялічкая замалёўка пра восень. Я напісала яе, калі вучылася ў 2-м класе. Тады мне было ўсяго 7 гадоў. Дарэчы, такая першая творчая спроба вельмі спадабалася маім родным. І я атрымала вялікую падтрымку з боку бацькоў, брата і сястры.

***— Зараз табе 21 год. І ў цябе ўжо ёсць свой паэтычны зборнік!..***

— Так. Да гэтага мае вершы друкаваліся ў газетах «Міёрскія навіны» і «Пераходны ўзрост», часопісах «Вясёлка» і «Бярозка». У 2016 годзе ў серыі «Маладая паэзія Беларусі» выйшла мая кніжка вершаў «Ідолта».

Вы, напэўна, спытаеце, чаму такая назва. Я з задавальненнем адкажу. Ідолта — гэта вёска ў Міёрскім раёне (дарэчы, родам я з Міёршчыны), што знаходзіцца непадалёку ад Мілашова, дзе праходзяць Мілашоўска-Мілашаўскія чытанні, падчас якіх я пазнаёмілася з многімі пісьменнікамі.

Дарэчы, Ідолта звязана і са знакамітым родам Мілашаў, якія з'яўляюцца сваякамі французскага паэта Оскара Мілаша і лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры Чэслава Мілаша.

***— У 2017 годзе ты стала членам Саюза пісьменнікаў Беларусі. Як гэта атрымалася?***

— Я вельмі марыла трапіць у гэтую літаратурную суполку. Для мяне Саюз пісьменнікаў Беларусі — найперш знаёмства з новымі людзьмі, магчымасць прымаць актыўны ўдзел у сучасным літаратурным і культурным жыцці краіны, вучыцца выказваць тое, што ў мяне на душы, і проста весці размову з творчымі людзьмі. У саюз я трапіла дзякуючы паэтцы Тамары Красновай-Гусачэнка. Менавіта яна распавяла пра СПБ і прапанавала мне ў яго ўступіць. Ідэя падалася мне цікавай. Я вырашыла, што так і зраблю, буду развівацца творча і надалей.

***— А як да тваёй творчасці аднесліся на факультэце?***

— Мяне вельмі падтрымалі выкладчыкі кафедры літаратуры, асабліва яе загадчык Алена Уладзіміраўна Крыклівец і дацэнт Вольга Іванаўна Русілка. Яны таксама члены Саюза пісьменнікаў Беларусі і заўсёды запрашаюць мяне паўдзельнічаць у розных літаратурных імпрэзах. Да таго ж паэткі дапамагаюць мне развівацца ў творчым плане, даюць розныя парады, заўжды падтрымліваюць.

Прыемна таксама, што практычна ўсе педагогі кафедры літаратуры і кафедры беларускага мовазнаўства цікавяцца маёй паэзіяй, маімі поспехамі, выказваюць свае меркаванні — гэта мяне таксама натхняе і матывуе ў далейшым займацца творчасцю.

***— Іра, як ты лічыш, якой аўдыторыі адрасавана твая паэзія?***

— Мае вершы адрасаваны хутчэй за ўсё дарослым людзям, але, лічу, і дзеткі могуць імі зацікавіцца. Акрамя вершаў я напісала некалькі казак, якія, спадзяюся, прыйдуцца даспадобы хлопчыкам і дзяўчынкам.

***— Як увогуле нараджаецца твая паэзія?***

— На напісанне вершаў мяне натхняе само жыццё. А ў ім шмат чаго цікавага... Часцей за ўсё мае творы філасофскай тэматыкі. Імкнуся сказаць, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці, жыццё фантастычна цудоўнае!

**— Вялікі дзякуй, Іра, за шчырую і цікавую размову!**

**Дар'я АНДРЫЦА,**
**студэнтка 3-га курса ФлФ.**